# Радуемся разам



Больш як 600 чалавек прайшлі перад журы падчас трохдзённага "усенароднага кастынгу", праведзенага у Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Выбіралі выканаўцаў на галоўныя ролі ў мюзікле "Блакітная камея" Кіма Брэйтбурга на лібрэта Карэна Кавалерана. Прэм'ера твора паспяховых маскоўскіх аўтараў у Мінску абвешчаная на 4 лютага 2011 года. Зрэшты, пра гэты незвычайны беларуска-расійскі праект "ЛіМ" распавядаў (гл. нумар за 23. 07. 2010 г.). Можна толькі дадаць, што, нягледзячы на адабраныя тры склады выканаўцаў, Кім Брэйтбург не лічыць выбар канчатковым. Наперадзе — размова з кожным прэтэндэнтам, бо, на думку нашага госця, многія проста не ўсведамляюць, якіх ахвяр вымагае ўдзел у такім спектаклі, наколькі напружанай будзе двухмесячная падрыхтоўка яго прэм'еры: а ў кожнага ж выканаўцы — сям'я, вучоба, праца... У ролі княжны Таракanaвай мы, верагодна, убачым салістку БДАМТа Ілону Казакевіч, заслужаную артыстку Беларусі Ірыну Дарафееву і студэнтку БДУ культуры і мастацтваў Кацярыну Муратаву.

**Заўтра адкрывае** свой новы сезон Магілёўскі дзяржаўны абласны тэатр лялек. Першы спектакль — "Выкраданне скарбаў" паводле бразільскай п'есы-казкі К. Мішаду — для самых юных гледачоў. Таксама для іх рыхтуецца і прэм'ера "Пчолка Зуза" магілёўскага драматурга Вольгі Бялевай, прымеркаваная на пачатак кастрычніка. Тым часам набліжаецца да завяршэння праца па рэстаўрацыі ды рэканструкцыі будынка тэатра. Плануецца, што да новага года магілёўскія лялечнікі вернуцца ў свой родны дом, дзе іх чакаюць утульныя грымеркі, мастацкія майстэрні для вырабу дэкарацый, памяшканне для тэатра-студыі, рэканструяваная глядзельная зала на 200 месцаў. Урачыстае адкрыццё абноўленага будынка супадзе са святкаваннем 35-годдзя Магілёўскага дзяржаўнага абласнога тэатра лялек: юбілей прыпадае на 2011 год.

**Пакінуўшы свет зямны,** мастак Міхась Рагалевіч застаўся сярод нас — сваёй самабытнай, існа беларускай, творчасцю. Наведвальнікі вернісажа "Зямля пад белымі крыламі" ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі прыпынялі крок, угледзеўшыся



у мудрую радасць і светлую прыгажосць яго "Бабінага лета"... Як зазначае мастацтвазнаўца Таццяна Гаранская, "яблынька — сакральны вобраз яго мастацтва, які атаясамліваецца з жыццём і лёсам чалавека ад юнацтва да мудрай старасці". Мала хто ведае пра драматычны сірочы лёс мастака, улюбёнымі персанажамі карцін якога былі дзеці ды прасветленыя, падобныя да іканапісных мадоннаў, беларускія жанчыны. Народжаны ў 1932 годзе на Уздзеншчыне ў сям'і беларускай шляхты, Міхась Рагалевіч страціў бацькоў (іх расстралялі па загадзе НКУС) і галадалым дзіцем трапіў у дзіцячы дом, але здолеў атрымаць мастацкую адукацыю і адметна раскрыць свой талент... Гэтымі днямі яго творчы свет захапляе і радуе наведвальнікаў галерэі сталічнага фальварка "Добрыя мыслі". Экспазіцыя жывапісу і графікі М. Рагалевіча, прымеркаваная да яго саракавін, прабудзе тут да 26 верасня.

**Лана ІВАНОВА**

*На здымках: расійскі кампазітар і прадзюсер Кім Брэйтбург; палатно Міхася Рагалевіча "Бабіна лета".*

*Фота Віктара Кавалёва і аўтара*